ПАМЯЦЬ НАЗАЎЖДЫ 3

ЛЮБІЦЬ КРАІНУ, БЫЦЬ РАЗУМНЫМІ 3

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

28 СНЕЖНЯ 2020 г. ПАНЯДЗЕЛАК № 252 (29366)

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ДАРЫЦЕ ЎСІМ ЛЮБОЎ І ДАБРЫНЮ»

Прэзідэнт паўдзельнічаў у дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці»

Навагодняе прадстаўленне «Чароўны свет», адным з гледачоў якога стаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, прайшло ў Палацы Рэспублікі.

На свята ў беларускую сталіцу былі запрошаныя 2370 дзяцей з усіх рэгіёнаў краіны. Большасць з іх — дзеці-сіроты, інваліды, дзеці са шматдзетных і малазабяспечаных сем'яў. Запрашэнне ў Палац Рэспублікі атрымалі кадэты, дзеці тых сілавікоў, якія загінулі ці атрымалі раненні, дзеці з раёнаў, пацярпелых ад катастрофы на ЧАЭС, і школьнікі-пераможцы конкурсаў, алімпіяд, выдатнікі вучобы.

Сёлета да святочных убораў хлопчыкаў і дзяўчынак дадаўся яшчэ адзін неабходны аксесуар — ахоўная маска. У Палацы Рэспублікі ўведзены масачны рэжым, таму рэкамендавалі мець яе ўсім удзельнікам свята. Але маленькія гледачы прызнаваліся, што ахоўныя меры навагодняму настрою не перашкода. Яны разумеюць неабходнасць засцярогі, многія ў будучым плануюць звязаць сваё жыццё з медыцынай, біятэхналогіямі. А сярод пажаданняў для сябе і блізкіх нават у самых маленькіх на першым месцы — здароўе.

Арцём Стасюк, дзевяцікласнік Гродзенскага абласнога кадэцкага вучылішча, за выдатную вучобу запрошаны на прэзідэнцкую ёлку, марыць стаць ваенным хірургам.

Фота БелТА.

Яго сябар Максім Кузняцоў займае адказную пасаду камандзіра ўзвода класа і задумваецца аб сур'ёзнай прафесіі — ваеннага разведчыка. «Радасць — залог здароўя. Жадаем усім людзям на свеце быць здаровымі, каб яны верылі ў шчаслівую будучыню», — кажуць хлопцы.

А школьніца з Гомельшчыны Дар'я, якая ў Палацы Рэспублікі ўпершыню, адзначае цудоўную атмасферу мерапрыемства. У руках дзяўчынкі паштоўка (якую атрымалі ўсе дзеці на свяце), на ёй Прэзідэнт Рэспублікі Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка віншуе з Новым 2021 годам і запрашае на вялікае навагодняе свята.

Аляксандр Лукашэнка, які традыцыйна бярэ ўдзел у навагоднім дзіцячым свяце, прызнаўся: для яго гэта адзін з самых хвалюючых дзён у годзе, таму што гэта дзень сустрэчы з юнымі грамадзянамі краіны.

«Хвалюешся таму, што заўсёды кажаш нешта дарослым людзям, а тут — будучыня нашай нацыі, — сказаў Прэзідэнт. — Хвалюешся і таму, што тут кожны год новыя твары, новыя людзі, але ўсіх нас аб'ядноўвае адно: мы ўсе чакаем цуду».

Ён нагадаў: з году ў год на дабрачынны спектакль збіраюцца новыя ўдзельнікі, але пастаянным застаецца тое, што хлопчыкі і дзяўчынкі, запрошаныя ў Палац Рэспублікі, самыя паспяховыя ў вучобе, творчасці ці спорце. Таксама сярод гледачоў — тыя дзеці, чыя жыццёвая сітуацыя патрабуе ўвагі і пра каго трэба клапаціцца асабліва.

Прэзідэнт выказаў удзячнасць усім тым, дзякуючы каму навагодняе свята ў Палацы Рэспублікі адбылося, і тым, хто ў гэтыя дні бярэ ўдзел у дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці».

СТАР. 2

КАРАТКА

- **У Беларусі з 1 студзеня 2021 года можна будзе разлічыцца за праезд па платных аўтадарогах банкаўскімі карткамі аплатнай сістэмы «Мір».**
- Прэзідэнцкія стыпендыі прызначаны 97 маладым навукоўцам.
- **Напярэдадні дня нараджэння БЧ каля 500 найлепшых прадстаўнікоў працоўных калектываў атрымала ўзнагароды.**

Год малой радзімы: вынікі

Фота mogilev-region.gov.by

Леанід ЗАЯЦ: «МЫ МОЦНЫЯ СВАІМІ КАРАНЯМІ»

За апошнія тры гады Прыдняпроўскі край стаў прыкметна прыгажэйшы і зручнейшы для яго жыхароў. Пабудаваны новыя масты, паліклінікі, спартыўныя аб'екты, жылыя дамы, больш глянцу набылі малыя населеныя пункты. Апошні прыклад — Бялынічы, якія сёлета прымалі рэспубліканскае свята — Дзень пісьменства. Невялічкі гарадок за год набыў сапраўдны еўрапейскі выгляд.

Тут і плошчы, і шматфункцыянальны забаўляльны цэнтр з 3D-кінатэатрам, і нават новы ўдвая большы, чым быў, музей з сучасным абсталяваннем. І гэты райцэнтр — не выключэнне. У размове са старшынёй Магілёўскага аблвыканкама высвятляем, што зроблена на працягу апошніх трох гадоў, якія прайшлі пад знакам Года малой радзімы.

СТАР. 4-5

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Завяршаецца падпіска на «Звязду» на I квартал або I паўгодзе 2021 года

НАЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«СЁННЯ САМАЯ ВЯЛІКАЯ ПРАБЛЕМА ДЛЯ НАШАГА ГРАМАДСТВА — ХВАРОБА ЛЮДЗЕЙ»

На каталіцкія Каляды Прэзідэнт наведаў Гарадскую дзіцячую інфекцыйную клінічную бальніцу Мінска

Сваю чарговую паездку ў медыцынскую ўстанову Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прысвяціў дзецям, хворым на каранавірус. Нагода асаблівая: многія з іх сустрэнуць самыя любімыя навагоднія святы ў бальнічных палатах. Каб крыху падтрымаць малых пацыентаў і іх бацькоў, кіраўнік краіны завітаў у дзіцячую бальніцу з падарункамі.

Прэзідэнт азнаёміўся з работай медыцынскай установы, арганізацыяй стацыянарнага лячэння пацыентаў з інфекцыяй COVID-19, а таксама з магчымасцямі клінікі па аказанні меддапамогі дзецям у аддзяленнях анестэзіялогіі і рэанімацыі.

Гарадская дзіцячая інфекцыйная клінічная бальніца — самая буйная медустанова для непаўналетніх у сталіцы і адзіны дзіцячы інфекцыйны стацыянар у краіне. Ён разлічаны на 600 ложкаў. Менавіта тут лечацца малыя з прыкметамі кавіда і пнеўманіямі. Таксама ў ГДІКБ аказваецца медыцынская дапамога пацыентам з хваробамі органаў дыхання, страўніка, нервовай сістэмы.

У клініцы працуюць 900 супрацоўнікаў, дзве трэці з іх — медыцынскі персанал.

Не лекамі адзінымі

Марына САКАЛОВА, галоўны ўрач бальніцы, адзначыла ў пачатку размовы функцыянальнасць медустановы па раздзяленні патокаў пацыентаў. Сістэма асобных будынкаў, што складаюць бальніцу, па яе словах, дазваляе хутка змяняць структуру ў залежнасці ад хваробы.

«Новы корпус, што мы пабудавалі, прымае пацыентаў з кішэчнымі хваробамі. Пры неабходнасці мы можам адаптаваць яго і пад тых, хто пакутуе ад іншых захворванняў», — дадала ўрач.

«Мы задумалі будаўніцтва новай бальніцы ў Мінску, у раёне Навінак. Нам неабходна жалезабетонна вызначыцца па функцыянальнасці. Да гэтага трэба імкнуцца. І не таму, што трэба эканоміць, а таму, што лячэнне чалавека — гэта яшчэ і псіхалогія, камфорт, утульнасць», — заўважыў Прэзідэнт.

Кіраўнік краіны нагадаў, што лячэнне кавідных хворых абыходзіцца ў істотныя сумы. «І не тое, што эканоміць, а па-гаспадарску трэба — і будаваць бальніцы правільна, і абсталёўваць гэтыя бальніцы рацыянальна», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Адказваючы на пытанне Аляксандра Лукашэнкі, чаго яшчэ не хапае ў лячэнні дзяцей, галоўурач сказала, што для гэтага ўсё ёсць: неабходная коўкасць ложкаў, памяшканні, абсталяванне.

Паводле слоў Марыны Сакаловай, калі ў будучыні ўкладаць грошы, то ў самае сучаснае тэхналагічнае абсталяванне. «Не трэба вялікія холы, канапы. Павінна быць абсталяваная палата. Вось гэта самае важнае», — сказала медык.

Быць там, дзе важна людзям

Пасля наведвання «чырвонай зоны» Аляксандр Лукашэнка пагутарыў з калектывам бальніцы і адказаў на пытанні не толькі медыкаў, але і журналістаў.

Прэзідэнт традыцыйна растлумачыў прычыну свайго прыезду ў чарговую бальніцу.

«Гэта стыль маёй работы на працягу чвэрці стагоддзя. Уборачная, пасяўная — я ў сялян. Ёсць праблемы ў зоне прамысловасці — я туды. Трэба нешта прадаць — я за мяжу. Сёння самая вялікая праблема для нашага грамадства — хвароба людзей. Дзякуй Богу, нас яна яшчэ крыху пашкадавала і шкадуе», — адзначыў кіраўнік краіны.

Па яго словах, галоўную ролю ў лячэнні адыгрываюць настрой і думкі. «Калі ты заходзіш у рэанімацыйную палату і бачыш, якія там вочы, — у хворых з'яўляецца надзея. Калі я дапамагу стварыць настрой аднаму-дваім — гэта ўжо плюс», — падзяліўся Аляксандр Лукашэнка.

Паводле даных, якія агучыў Прэзідэнт, у Беларусі знізілася колькасць шпіталізаваных з пнеўманіямі. Калі раней іх было каля 22 тысяч чалавек, то на пятніцу — 20 тысяч, пры гэтым колькасць тых, хто знаходзіцца на апаратах штучнай вентыляцыі лёгкіх (ШВЛ), застаецца прыкладна на адным узроўні — каля 500 чалавек.

Кіраўнік дзяржавы расказаў, што да новага года збіраецца пабываць яшчэ ў адной клініцы — РНПЦ дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі ў Бараўлянах.

«Галоўнае — прынцып добраахвотнасці»

Так Аляксандр Лукашэнка выказаўся пра масавую вакцынацыю ад каранавіруса. «Вакцынацыя будзе. Захочаце — вакцынуйцеся, не захочаце — нікога прымушаць не будзем, вырашайце самі», — падкрэсліў кіраўнік краіны.

Па яго словах, ахвотным прышчапіцца дадуць магчымасць выбраць, вакцынай якога вытворцы гэта зрабіць. Але ў асноўным будуць вакцынаваць расійскім прэпаратам, які плануюць стварацъ у Беларусі.

«Мы хочам яшчэ 5-6 вакцын прывезці ў Беларусь», — адзначыў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што асабіста ён адносіцца да катэгорыі скептыкаў, якія лічаць, што пры нармальным спосабе жыцця чалавек мае дастатковы імунітэт для супрацьстаяння шматлікім захворваннем.

У канцы трылогіі

Прэзідэнт у размове з супрацоўнікамі бальніцы закрануў не толькі медыцынскія тэмы. Напрыклад, кіраўнік дзяржавы падвёў вынікі трылогіі Года малой радзімы. «Ад Мінска да аграгарадкоў мы дайшлі. Цяпер трэба закончыць рамонт дарог у аграгарадках. За гэту пяцігодку мы тое дакладна зробім, каб былі нармальныя двухпалосныя дарогі. Буйныя вёскі не кінулі і нават маленькія, неперспектыўныя хутары не думаем закідваць», — падзяліўся Аляксандр Лукашэнка планамі і ўжо зробленым.

Прэзідэнт дадаў, што шкадуе — не прапанаваў ідэю аднаўлення закінутых вёсак і хутароў раней. Ён нагадаў, што напярэдадні выбараў і пасля агітаваў гараджан купляць маленькія ўчасткі зямлі і будаваць там дамы. «Каб вы ў суботу, нядзелю з дзеткамі проста пахадзілі па зямлі, — растлумачыў кіраўнік дзяржавы. — Шмат хто кажа: басанож пахадзі па зямлі, па траве — і ўся дурная энергія сыходзіць у зямлю».

Дзеці — святое

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў дакладна высветліць прычыны смерці дзіцяці 16 снежня ў Гарадской дзіцячай інфекцыйнай клінічнай бальніцы Мінска.

«Таго, каго трэба лячыць, таго трэба лячыць і рятаваць. Каб не было вось так, як у вас атрымалася (можа, не столькі ў вас) з гэтым 13-гадовым хлопчыкам. Я не абвінавачваю пакуль нікога. Усякае можа быць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

У бальніцы, як расказала галоўны ўрач, падлетак правёў менш за суткі. «А чым займалася паліклінічнае звяно? Не павінна гэтага быць. Вы бацькам не растлумачыце. Вы ж сама мама (звяртаючыся да Марыны Сакаловай. — **«Зв.»**). Я бацька. Разумееце, для мяне дзіця — гэта больш чым святое, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Мы павінны былі распачаць усякія меры для таго, каб выратаваць дзіця. Калі памірае дзіця — гэта катастрофа».

«Калі нашы ўрачы не ўмеюць з нейкімі відамі хвароб змагацца, калі яны ўвогуле не разумеюць, што гэта такое, ну дык мы будзем іх вучыць. Гэта ж зразумела, яны ж не богі», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што трэба своечасова і аператыўна рэагаваць на хваробу, асабліва ў дзяцей.

«Палітычных гульняў не было»

Аляксандр Лукашэнка расказаў і пра тое, як прымалася рашэнне аб вяртанні ў Беларусь мітрапаліта Мінска-Магілёўскага арцыбіскупа Тадэвуша Кандрусевіча.

Пытанне датычылася нядаўняй сустрэчы кіраўніка дзяржавы са спецпасланнікам Папы Рымскага Францыска апостальскім нунцыем у Вялікабрытаніі арцыбіскупам Клаўдзіа Гуджэроці і вяртання ў краіну Тадэвуша Кандрусевіча.

«Вы ведаеце мой недахоп як палітыка. Мяне часта нават звычайныя людзі папракаюць: «Аляксандр Рыгоравіч, ну навошта вы вось гэта кажаце, навошта вы душу раскрываеце? Яны ж плюнуць вам тут... Я прыхільнік шчырай, сумленнай і адкрытай палітыкі. Хоць у палітыцы няма такога, быць не павінна. Але раскажу вам сумленна і шчыра, як гэта было. Галоўнае. Там шмат было пытанняў», — адзначыў Прэзідэнт.

Ён распавёў, што Клаўдзіа Гуджэроці перадаў яму ліст ад пантыфіка. «Вы ведаеце мае адносіны з Папам Францішкам. Я яго вельмі паважаю. Гэта такі наш чалавек. Ён не гуляецца ў палітыку, хоць ён жа кіраўнік дзяржавы. Я яго ліст прачытаў прама пры Гуджэроці. Дробным шрыфтам на двух лістах. Вельмі шмат добрых слоў у адрас дзяржавы, у адрас людзей. Добры чалавек. І адно з пытанняў — вярнуць на Каляды Кандрусевіча», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Я ж разумею, гэта таксама палітыка. Кожны хоча захаваць твар, яшчэ штосьці. У мяне на той час, хоць я меркаваў, што гэтае пытанне будзе ад Гуджэроці (мы таксама даўно знаёмыя, ён у нас працаваў, талковы таксама чалавек, вельмі любіць беларускі народ і заўсёды адкрыта і сумленна выказваўся ў падтрымку нашага народа. Таму яго і выбралі, хоць ён у Вялікабрытаніі ўжо служыць нунцыем), не было рашэння, калі ён мне сказаў пра Кандрусевіча. Я сумленна яму прызнаўся пры міністры», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што, улічваючы прачытаны ліст і просьбу Папы Рымскага, паабяцаў, што да вечара дня сустрэчы будзе дадзены адказ. «Гэта значыць, у мяне не было гатовага рашэння. Гэта не гульня ў палітыку», — падкрэсліў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што тады даручыў ураду, МЗС і іншым выпрацаваць сваю пазіцыю па гэтым пытанні і паведаміць яму.

«Пазіцыя была такая, што трэба, каб ён вярнуўся на гэтыя каталіцкія святы ў Беларусь, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Я ўжо падумаў пра людзей. Ведаеце, каталікі людзі асаблівыя, але яны ж ніколі нам ніякіх праблем не ствараліі».

На жорсткім кантролі

Прэзідэнт расказаў таксама пра затрыманне тэрарыстычнай групы Аўтуховіча. «Нядаўна мы затрымалі групу Аўтуховіча. Мярзотнікі апошнія. Зараз мы ўсе іх каналы ўскрылі. Яны везлі тонамі зброю праз Украіну, — расказаў кіраўнік дзяржавы. — І калі б хлопцы нашы (я ўсіх загадаў да дзяржаўных узнагарод неадкладна прадставіць) іх не накрылі, ох нам бы Новы год быў...».

Кіраўнік краіны паведаміў, што група рыхтавала тэракты па ўсёй краіне і ўжо пачала ажыццяўленне плана. Прэзідэнт падкрэсліў, што пытанне стрымлівання падобнай супрацьпраўнай дзейнасці трымаецца на жорсткім кантролі: «Ёсць яшчэ некалькі груповак. Свае два-тры (чалавекі ў гэтых групоўках. — **«Зв.»**) ёсць, адтуль дасылаюць нам. Праз Украіну. Праз Польшчу, Літву цяпер вельмі складана — граніцу закрылі наглуха. І з Украінай цяпер закрылі ўжо, мыш не прапаўзе. Праз Расію часам пранікаюць, у нас граніцы няма. Але ўжо не тое. Мы гэтае пытанне трымаем жорстка на кантролі».

Марыя ДАДАЛКА.

ПАСТУПОВА І НЕНАМНОГА

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 490 «Аб устанаўленні тарыфаў для насельніцтва ў сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі на 2021 год». У выніку прымянення зацверджаных тарыфаў жыллёва-камунальныя плацяжы для насельніцтва ў разліку на тыпавую двухпакаёвую кватэру з трыма жыльцамі пры нарматыўным спажыванні імі паслуг павысяцца ў межах $5.

Павышэнне тарыфаў адбудзецца ў два этапы. З 1 студзеня на $4,2 падаражэюць паслугі па тэхнічным абслугоўванні і капітальным рамонце жылых дамоў, газа-, электра- і водазабеспячэння, водаадвядзення, па абыходжанні з цвёрдымі камунальнымі адходамі, тэхнічным абслугоўванні ліфта, запорна-перагаворных прылад, санітарным утрыманні дапаможных памяшканняў шматкватэрнага жылога дома, памеры кампенсацыі выдаткаў на электраэнергію. З 1 чэрвеня на $0,8 вырастуць тарыфы на паслугі цеплазабеспячэння для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

Ва ўмовах росту жыллёва-камунальных плацяжоў будзе працягнута работа па дзяржаўнай падтрымцы насельніцтва праз выдзяленне безнаяўных жыллёвых субсідый. Такія субсідыі даюцца грамадзянам і сем'ям пры наступнай умове: штомесячная сума камунальных плацяжоў перавышае 20 % іх сярэднямесячнага сукупнага даходу ў горадзе і 15 % — у сельскай мясцовасці. Напрыклад, за студзень—кастрычнік гэтага года безнаяўныя жыллёвыя субсідыі атрымала амаль 20,5 тысячы сем'яў на суму Br1,36 млн. Сярэдняя сума субсідыі на адну сям'ю склала Br5,54 у месяц.

«ДАРЫЦЕ ЎСІМ ЛЮБОЎ І ДАБРЫНЮ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Паважаныя дарослыя, прадпрымальнікі, бізнесмены, проста людзі добрай волі, дазвольце мне ад імя беларускага народа чарговы раз падзякаваць вам за тую дабрыню і цеплыню, якую вы дорыце ў гэтыя перадnавагоднія і навагоднія дні ўсім, хто мае патрэбу. Гэта сапраўды прыклад і паказчык нашай нацыі — добрай, талерантнай і вельмі перспектыўнай», — сказаў кіраўнік краіны.

Ён падкрэсліў, што не будзе нечага раіць малым беларусам, але скажа пра галоўнае. Кіраўнік краіны звярнуўся да малых з просьбай заўсёды любіць сваіх родных і блізкіх, берагчы бацькоў, паважаць настаўнікаў і выхавальнікаў.

«Гэта самыя добрыя і цёплыя людзі, што ёсць на зямлі. І памятайце, цудоўны свет, што мы ўбачым сёння на гэтай сцэне, — гэта перадусім любоў і дабрыня. Дарыце ўсім сваю любоў і дабрыню. Калі вы будзеце яе дарыць іншым, у адказ таксама будзеце любімыя і атрымаеце тую ж дабрыню», — завяршыў прамову Прэзідэнт.

Пасля прадстаўлення кожны маленькі ўдзельнік свята атрымаў падарунак — заплечнік з пазламі і цукеркамі.

Марыя ДАДАЛКА.

«Нашы дзеці»

ЯНЫ ЎСЕ — НАШЫ

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА ў рамках акцыі «Нашы дзеці» наведала сацыяльна-педагагічны цэнтр Полацкага раёна і паўдзельнічала ў навагоднім святе, паведамляе БелТА.

Фота БелТА.

Спікер верхняй палаты парламента адзначыла, што з задавальненнем далучылася да акцыі і зарадзілася энергіяй ад дзяцей.

«Заўсёды з вялікай радасцю бываю ў дзіцячых калектывах, асабліва напярэдадні такіх цудоўных свят — Раства і Новага года. У нашай дзяржаве вялікая ўвага аддаецца дзецям. Важна, што ім дораць радасць тыя людзі, якія з імі працуюць. Вялікая павага работнікам сацыяльных прытулкаў, дзіцячых інтэрнатных устаноў і наогул усім, хто працуе з дзецьмі, таму што ўсе рабяты — нашы», — сказала старшыня Савета Рэспублікі і дадала, што яна заўсёды з радасцю бывае на малой радзіме.

Наталля Качанава пажадала дзецям быць разумнымі, мужнымі, любіць свой горад і краіну. Спікер верхняй палаты парламента ўручыла дырэктару цэнтра Вікторыі Каралёвай сертыфікат на мультыборд і салодкія падарункі дзецям. Ад Полацкага райвыканкама ўстанове падарылі стол для малявання пяском.

Таксама Наталля Качанава правяла сёння рабочую сустрэчу са святарамі Полацкай і Глыбоцкай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы.

Далучыцца да шчырых эмоцый

Салодкія падарункі і апошнія кніжныя навінкі беларускіх выдавецтваў прымалі ў рамках рэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці» выхаванцы Бялыніцкай дапаможнай школы-інтэрната. Павіншаваць дзяцей і іх настаўнікаў з надыходзячым Новым годам завітаў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй КУНЦЭВІЧ.

— Акцыя «Нашы дзеці» вучыць нас быць уважлівымі і клапатлівымі, — адзначыў ён. — Дарослыя, якія хоць раз бралі ўдзел у гэтым марафоне добрых спраў, ужо ніколі не змогуць застацца абыякавымі да тых шчырых эмоцый, якія дораць дзеці. Наша рэспубліканская акцыя дазваляе рабіць добрыя справы для тых, хто больш за іншых мае патрэбу ва ўвазе.

Андрэй Кунцэвіч выказаў падзяку супрацоўнікам і педагогам Бялыніцкай школы-інтэрната за іх добрасумленную працу з «асаблівымі» дзецьмі. Усяго ў школе-інтэрнаце вучыцца 85 дзяцей, з іх 56 — сіроты. У якасці падарункаў установа таксама атрымала грашовыя сертыфікаты, бытавую тэхніку, кухонны посуд.

— Мы вельмі ўдзячны нашым дабрачынцам за ўвагу і падарункі, — адзначыў **дырэктар школы-інтэрната Аляксандр МАМЧАНКА.** — Дзеці бачаць клопат людзей, якія неабыякавыя да іх лёсу. Яны чакаюць гэтых візітаў і рыхтуюцца да іх. З задавальненнем выступаюць перад гасцямі з навагоднімі нумарамі і дораць зробленыя сваімі рукамі падарункі.

Фота БелТА.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ПАМЯЦЬ НАЗАЎЖДЫ

Рэспубліканскі патрыятычны праект «Памяць сэрца» 24 снежня фінішаваў на плошчы Перамогі ў Мінску, паведамляе БелТА.

У мемарыяльнай зале ў гонар Гераяў Савецкага Саюза, якія загінулі пры вызваленні Беларусі, сабраліся навучэнцы і студэнты, прадстаўнікі працоўнай моладзі, органаў улады і грамадскіх аб'яднанняў, каб падвесці вынікі патрыятычнага праекта.

«Стварэнне віртуальнага альбома працягнем, але з сённяшняга дня матэрыял, які сабралі раней, будзем паказваць у мемарыяльнай зале на плошчы Перамогі. Кожны ахвотны зможа азнаёміцца з гістарычнымі фатаграфіямі і біяграфіямі гераяў», — адзначыў **першы сакратар Мінскага гарадскога камітэта БРСМ Раман БАНДАРУК.**

Патрыятычны праект «Памяць сэрца» стартаваў у Дзятлаўскім раёне Гродзенскай вобласці 13 снежня. Усяго было праведзена 270 мерапрыемстваў, сярод якіх мітынгі-рэквіемы ў памятных мясцінах, а таксама цыкл камунікацыйных пляцовак з моладдзю «Дыялог пакаленняў».

Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

Акцэнты

ПАГРОЗА МІЖНАРОДНАМУ МІРУ І БЯСПЕЦЫ

Прэзідыум Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь зрабіў заяву ў сувязі з ухваленнем Сенатам Кангрэса ЗША законапраекта па Беларусі.

У дакументе гаворыцца, што Сенат Кангрэса ЗША 21 снежня 2020 года ўхваліў законапраект па Беларусі, які ў парушэнне Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый уяўляе сабой грубае ўмяшанне ва ўнутраныя справы Рэспублікі Беларусь.

«Амерыканскія заканадаўцы, прыкрываючыся адстойваннем правоў чалавека, спрабуюць аказаць прамы ціск на беларускія ўлады ў сітуацыі, калі ў саміх Злучаных Штатах да гэтага часу не спыняюцца бязлітасныя спрэчкі адносна вынікаў мінулых прэзідэнцкіх выбараў. Абвяшчаючы ўласную манаполію на праўду, яны не жадаюць разабрацца ў падзеях, якія адбываюцца ў нашай краіне, і пачуць беларускіх парламентарыяў — голас праўды», прыводзіць тэкст заявы прэс-служба верхняй палаты беларускага парламента.

У Савеце Рэспублікі падкрэсліваюць, што сусветная супольнасць прызнала нашу краіну суверэннай, стабільнай і эканамічна развітой дзяржавай — сур'ёзным донарам рэгіянальнай бяспекі.

З пункту гледжання беларускіх заканадаўцаў, выклікае здзіўленне імкненне амерыканскіх сенатараў перашкодзіць развіццю адносін Беларусі і Расіі, умацаванню сяброўскіх сувязяў паміж народамі дзвюх краін, у той час як у самім амерыканскім грамадстве раскол усё паглыбляецца.

«Амерыканскім заканадаўцам, якія праяўляюць «бацькоўскі клопат» аб беларускім народзе, варта аддаць увагу праблемам уласных выбаршчыкаў, асабліва ва ўмовах нарастаючай пандэміі COVID-19, абароне свабоды СМІ і свабоды выказвання меркаванняў у краіне і ў сваіх выбарчых акругах», акцэнтуецца ўвага ў дакументе.

На думку беларускіх сенатараў, прыняцце антыбеларускага законапраекта стварае пагрозу міжнароднаму міру і бяспецы.

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са смерцю дырэктара тэлерадыёкампаніі «Пінск» Віктара Іванавіча СЫРАВАТКІ і выказвае глыбокае спачуванне яго родным і блізкім.

ІНСТРУМЕНТ САНКЦЫЙНАГА ЦІСКУ ПЕРАЙШОЎ НА НЕПРЫМАЛЬНЫ ЎЗРОВЕНЬ

Нацыянальны савет падтрымаў ініцыятыву Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі накіраваць зварот у Міжнародную арганізацыю працы

Гэта рашэнне прынята на пасяджэнні Нацсавета па працоўных і сацыяльных пытаннях у сувязі з увядзеннем Еўрапейскім саюзам эканамічных санкцый у дачыненні да асобных беларускіх прадпрыемстваў, паведамілі ў прэс-службе ФПБ.

Нагадаем, што ў склад Нацыянальнага савета ўваходзяць прадстаўнікі трох бакоў — рэспубліканскіх аб'яднанняў прафсаюзаў, найманых работнікаў і ўрада. Савет на пастаяннай аснове разглядае найбольш актуальныя і праблемныя пытанні працоўнай і сацыяльна-эканамічнай сфер. З улікам таго, што рашэнне ЕС аб увядзенні санкцый можа наўпрост закрануць інтарэсы працоўных, гэтае пытанне стала адным з асноўных на праведзеным пасяджэнні.

— Мы бачым, што апошнім часам інструмент санкцыйнага ціску Еўрапейскага саюза перайшоў на непрымальны ўзровень. Санкцыі могуць быць уведзеныя без якога-небудзь доказнага абгрунтавання ў дачыненні да любых прадпрыемстваў, — адзначыла **намеснік старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Алена МАНКЕВІЧ.** — Падобныя спробы абмежаваць работу прадпрыемстваў могуць прывесці да зніжэння заробкаў, скарачэння рабочых месцаў і замарожвання гарантаваных калектыўнымі дамовамі выплат работнікам. Усё гэта ў выніку адбіваецца на людзях, парушае іх права на працу. У сувязі з гэтым мы прапануем ад імя Нацыянальнага савета падрыхтаваць зварот да Міжнароднай арганізацыі працы з заявай аб недапушчальнасці парушэння Еўрапейскім саюзам нашых працоўных правоў.

Варта адзначыць, што Міжнародная арганізацыя працы — гэта спецыялізаваны інстытут Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, галоўная мэта якога — садзейнічаць абароне працоўных правоў, пашырэнню магчымасцяў дастойнай занятасці, умацаванню сацыяльнай абароненасці і развіццю дыялогу па пытаннях, звязаных са сферай працы.

Урад і аб'яднанне наймальнікаў падтрымалі ініцыятыву нацыянальнага прафцэнтра. У найбліжэйшы час зварот ад імя трох бакоў Нацсавета будзе накіраваны ў МАП.

У тэму

ФПБ накіравала скаргу ў ААН на дзеянні Еўрасаюза

Зварот падрыхтаваны ў сувязі з прыняццем Еўрапейскім саюзам эканамічных санкцый у дачыненні да асобных беларускіх прадпрыемстваў і накіраваны ў адрас Савета па правах чалавека Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, паведамілі ў прэс-службе нацыянальнага прафцэнтра.

Як адзначылі ў Федэрацыі прафсаюзаў, Еўрапейскі саюз неаднаразова прымаў рашэнні аб увядзенні неабгрунтаваных дыскрымінацыйных мер эканамічнага характару ў дачыненні да нашай краіны. Гэта супярэчыць асноватворным прынцыпам міжнароднага права. Так, Генеральная Асамблея ААН і Савет ААН па правах чалавека ў сваіх рэзалюцыях не раз падкрэслівалі, што аднабаковыя прымусовыя меры супярэчаць міжнароднаму праву, Статуту ААН, а таксама нормам і прынцыпам, якія рэгулююць мірныя адносіны паміж дзяржавамі.

Таксама дадзеныя меры не ўлічваюць пазіцыю ААН аб тым, што падобныя дзеянні амаль заўсёды аказваюць сур'ёзнае ўздзеянне на эканамічныя і сацыяльныя правы людзей, ушчамляюць права на працу і маюць негатыўныя з далёкай перспектывай наступствы для ўсяго насельніцтва дзяржаў, супраць якіх накіраваны такія меры, падкрэсліваецца ў звароце.

— Міжнародныя права абавязвае ўсе краіны паважаць права чалавека на працу. У тым ліку патрабуе, каб дзяржавы ўстрымліваліся ад дзеянняў, якія прама ці ўскосна перашкаджаюць ажыццяўленню гэтага права, — падкрэсліла **сакратар ФПБ па міжнароднай рабоце Ганна ВАРФАЛАМЕЕВА.** — Прынятыя Еўрасаюзам рашэнні аб увядзенні санкцый наўпрост супярэчаць гэтым патрабаванням і ўшчамляюць права на працу работнікаў прадпрыемстваў, якія трапілі ў санкцыйны спіс, паколькі абмежаванне дзейнасці прадпрыемстваў можа прывесці да зніжэння заробкаў і страты рабочых месцаў.

У сувязі з гэтым Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі настойвае на прызнанні дзеянняў ЕС неправамернымі і просіць Савет па правах чалавека аказаць садзейнічанне ў адмене дадзеных мер.

«МЫ МОЦНЫЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Леанід Канстанцінавіч, завяршаецца 2020 год, апошні ў трылогіі Года малой радзімы. Наколькі ён быў рэзультатыўны?

— Год быў няпросты. Утрымаць пазіцыі — гэта была задача-мінімум для ўсяго рэгіёна. Нават ва ўмовах сусветнай пандэміі і закрыцця граніц мы здолелі захаваць бесперапынную работу прадпрыемстваў і не дапусцілі масавых скарачэнняў работнікаў. У першым паўгоддзі сутыкнуліся са зніжэннем вытворчасці, але пачынаючы з чэрвеня ўзровень валавога рэгіянальнага прадукту пачаў аднаўляцца і па дзесяці месяцах перавысіў узровень мінулага года. Улічваючы сітуацыю ў свеце, нават сам факт захавання леташніх пазіцый — добры вынік. У суседніх краінах наогул зафіксаваны спад вытворчасці. Еўропа перажывае новы эканамічны крызіс. Узважаная, абдуманая палітыка нашай дзяржавы і Прэзідэнта сыграла ключавую ролю ў тым, што Беларусь годна спраўляецца з усімі выклікамі.

— Год быў цяжкі, але плённы ў плане будаўніцтва. Столькі новых аб'ектаў у Магілёве і вобласці не адкрывалася, напэўна, нават у лепшыя гады.

— Так. У нас атрымалася нарасціць аб'ёмы будаўніча-мантажных работ. Уведзена ў эксплуатацыю каля 300 тысяч квадратных метраў жылля, больш за 1000 шматдзетных сем'яў змаглі палепшыць свае жыллёвыя ўмовы. Мы ўвялі ў строй шэраг вельмі важных сацыяльных аб'ектаў — паліклінікі ў Магілёве, Кіраўску, Асіповічах, Мсціславе, дзіцячую бальніцу ў Бабруйску, дзіцячыя садкі ў Шклоўскім раёне, Бабруйску і Слаўгарадзе, біятлонны комплекс у Чавусах, басейны, спартыўныя пляцоўкі, цэнтры культуры. Вялікая ўвага аддаецца будаўніцтву і рамонту дарог, развіццю транспартнай інфраструктуры. Сёлета ўведзены ў эксплуатацыю мост праз раку Сож у Слаўгарадскім раёне. Удзел у яго адкрыцці браў асабіста Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. А ў канцы лістапада мы паставілі кропку ў глабальнай рэканструкцыі вялікага ўчастка аўтамабільнай дарогі «Магілёў—Чэрыкаў—Касцюковічы».

У Магілёве поўным ходам ідзе будаўніцтва дубль-трасы вуліцы Якубоўскага, у наступным годзе плануецца здаць у эксплуатацыю першую чаргу. Новыя мікраёны горада Спадарожнік і Казіміраўка будуць звязаныя з праспектам Касманаўтаў яшчэ адной дарогай. Гэта шмат у чым вырашыць транспартную праблему ў абласным цэнтры.

Калі казаць пра іншыя важныя аб'екты, то тэрміны іх уводу ў эксплуатацыю не мяняюцца. Па плане ідзе будаўніцтва фізкультурна-аздараўленчага комплексу па вуліцы Фаціна ў Магілёве. Сёлета мы ўводзім першую чаргу — адміністрацыйны корпус, а налета будзе завершана будаўніцтва двух басейнаў. Таксама ў наступным годзе плануем запусціць у работу вельмі неабходны для нашых жыхароў сучасны кардыяхірургічны корпус абласной бальніцы.

У планах таксама будаўніцтва новага інфекцыйнага корпуса для Магілёўскай бальніцы № 1. Магіляўчане і жыхары раёнаў не па чутках ведаюць пра сённяшні стан магілёўскай інфекцыйнай бальніцы па вуліцы Бярозаўскай. Відавочна, што неабходна паляпшаць умовы лячэння пацыентаў з інфекцыйнымі захворваннямі. Мы пракансультаваліся з аўтарытэтнымі спецыялістамі і прыйшлі да высновы, што ўзводзіць новы будынак разумна побач з існуючым стацыянарам. Вырашана, што гэта будзе Магілёўская бальніца № 1, дзе сёння працуе інфекцыйнае аддзяленне.

Цэнтралізацыя інфекцыйнай службы на базе шматпрофільнага стацыянара дазволіць не толькі палепшыць умовы для аказання медыцынскай дапамогі пацыентам з інфекцыйнымі захворваннямі, але і арганізаваць цэнтралізаваны амбулаторны прыём і дыспансерызацыю інфекцыйных пацыентаў. Сусветная пандэмія каранавіруса, якая закранула і нашу краіну, навучыла нас многаму. Спатрэбіліся новыя падыходы ў рабоце выканаўчай улады, у сістэме аховы здароўя і эканоміцы.

Магілёўшчына сёлета сустракала Дзень беларускага пісьменства.

— Сёлета было падоўжана дзеянне Праграмы па развіцці паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўшчыны і з'явіліся новыя прэферэнцыі. Наколькі гэта важна для развіцця раёнаў, якія ўключаны ў дадзеную праграму?

— Гэта новыя магчымасці для іх развіцця, і вялікі дзякуй Прэзідэнту за тое, што дзеянне дакумента падоўжана яшчэ на пяць гадоў. Новы ўказ мае шэраг прэферэнцый. Вызначаны парадак кампенсацыі выдаткаў юрыдычных асоб пры рэалізацыі імі інвестпраектаў з прыцягненнем крэдытаў Банка развіцця. А гэта 20 % ад кошту капітальных выдаткаў без ПДВ аднаразова па факце ўводу аб'екта ў эксплуатацыю і 15 % штомесяц на працягу трох гадоў з даты выхаду аб'екта на поўную праектную магутнасць. Для грамадзян, якія маюць бесперапынны працоўны стаж у арганізацыях паўднёва-ўсходняга рэгіёна і якія жывуць у арэндным жыллі дзесяць і больш гадоў, прадугледжана магчымасць выкупу яго па цане ў памеры 10 % ад ацэначнага кошту. Пагадзіцеся, гэта вельмі істотныя прэферэнцыі.

Што датычыцца мерапрыемстваў у сферы вытворчасці, то асноўная стаўка робіцца на суб'екты малога і сярэдняга бізнесу, якія плануюць далейшае развіццё сваіх вытворчасцяў. У асноўным гэта сфера дрэваапрацоўкі.

Калі казаць пра прамысловасць, то найбольш значныя праекты — стварэнне вытворчасці драўнянага вугалю ў Клімавіцкім раёне і арганізацыя вытворчасці кандытарскіх вырабаў у Слаўгарадскім.

Працягнецца работа па тэхнічным пераўзбраенні лесанарыхтоўчых вытворчасцяў лясгасаў і набыцці сучаснай лесанарыхтоўчай тэхнікі.

Паколькі паўднёва-ўсходні рэгіён мае сельскагаспадарчую накіраванасць, асноўная стаўка будзе зроблена менавіта на павышэнне эфектыўнасці работы арганізацый гэтай галіны праз зніжэнне выдаткаў і павышэнне якасці прадукцыі. У сельскагаспадарчых арганізацыях стаіць задача да 2025 года забяспечыць тэмп росту аб'ёмаў вытворчасці ў параўнанні з 2019 годам на ўзроўні 195,9 працэнта.

У сацыяльнай сферы прадоўжыцца работа па аптымізацыі сеткі ўстаноў адукацыі, забеспячэнні іх абсталяваннем і сродкамі навучання, абнаўленні аўтобуснага парка для падвозу навучэнцаў. У праграме таксама закладзены мерапрыемствы па рэканструкцыі і капітальным рамонце ўстаноў аховы здароўя і адукацыі.

Для прыцягнення ў рэгіён рабочай сілы і замацавання наяўных працоўных рэсурсаў, у тым ліку маладых спецыялістаў, у гэтым годзе ў паўднёва-ўсходнім рэгіёне вобласці плануецца ўвесці ў строй 20 тысяч квадратных метраў агульнай плошчы жылых памяшканняў. А за перыяд з 2021 да 2025 года — 77,5 тысячы квадратных метраў.

— Сёлета да абласных «Дажынак» рыхтаваліся Асіповічы. Правесці маштабныя гулянні не дазволіла неспрыяльная эпідабстаноўка. Тым не менш, горад стаў прыгажэйшы, абнавіліся яго сацыяльна значныя аб'екты. Як падобныя мерапрыемствы дапамагаюць «падцягнуць» невялікія гарады да абласнога ўзроўню ў плане камфортнага пражывання і доступу да паслуг?

— Прымаючы такія святы, любы населены пункт імкнецца дастойна сустрэць гасцей, пакінуць добрае ўражанне. Асіповічам патрэбны быў глянец. Таму ў ходзе падрыхтоўкі да свята раённы цэнтр актыўна добраўпарадкоўвалі. Зроблены рамонтныя работы вулічна-дарожнай сеткі, капітальна адрамантаваны некалькі вуліц, новае аблічча прыняў цэнтральны гарадскі парк, праведзены капітальны рамонт шэрагу жылых дамоў. Горад змяніўся, атрымаў больш сучасны выгляд.

Але не фактар правядзення якога-небудзь свята павінен быць галоўны ў імкненні «падцягнуць» невялікія гарады да абласнога ўзроўню. Ёсць пэўныя сацыяльныя стандарты, ёсць людзі з іх патрэбамі, жаданнем жыць у камфортным асяроддзі. Нават калі б гэтае свята ў Асіповічах не планавалася, рэканструкцыя той жа раённай паліклінікі, гімназіі, цэнтра сацыяльнай абароны, стадыёна ўсё роўна адбылася б. У гэтым вы можаце пераканацца, калі праедзеце па іншых райцэнтрах вобласці. Напрыклад, у Мсціславе сёлета мы адкрылі паліклініку і гарадскую лазню.

Развіццё малых гарадоў — гэта сапраўды вельмі важнае пытанне, якое павінны вырашаць і вырашаюць органы ўлады. Неабходна і далей рабіць усё, каб чалавек мог камфортна жыць, выхоўваць дзяцей, годна зарабляць, а не глядзець у бок абласных цэнтраў ці сталіцы.

— «Дажынкі» і «малая радзіма» — паняцці сугучныя, бо чым лепшы вынік работы канкрэтнай гаспадаркі, тым багацейшы населены пункт, дзе яна знаходзіцца. Гэты год, нягледзячы на ўсе яго складанасці, быў выніковы. Магілёўшчына сёлета прадэманстравала станоўчыя паказчыкі ў раслінаводстве і ў жывёлагадоўлі. Як вы ацэньваеце зробленую работу?

— Сёлета мы сабралі адзін мільён 283 тысячы тон збожжа — на 38 % больш, чым летась. Істотна выраслі і сярэдняя ўраджайнасць. Яна склала 36 цэнтнераў з аднаго гектара. Па двух гэтых паказчыках Магілёўшчына заняла чацвёртае месца ў рэспубліцы, а па шэрагу іншых выйшла на перадавыя пазіцыі ў краіне.

У вобласці была зроблена стаўка на зерне кукурузы — яе пасевы мы павялічылі ўдвая. Для забеспячэння жывёлагадоўлі таннымі травянымі кармамі працягваем работу па пашырэнні плошчаў і паляпшэнні структуры шматгадовых траў, у першую чаргу бабовых. Мы засеялі люцэрнай 20 тысяч гектараў, павялічыўшы яе плошчы ў структуры шматгадовых траў да 30 %.

За кошт выканання тэхналагічных рэгламентаў забяспечаны рост аб'ёмаў вытворчасці ў жывёлагадоўлі, прыплод буйной рагатай жывёлы павялічыўся ў 1,3 раза.

Уведзены ў эксплуатацыю два свінакомплексы ў Бялыніцкім і Слаўгарадскім раёнах, запланавана будаўніцтва свінагадоўчага

Бялынічы сталі прывабным і па-еўрапейску ўтульным горадам.

СВАІМІ КАРАНЯМІ»

комплексу на 24 тысячы галавы адкорму ў год з замкнёным цыклам і рэпрадуктара на 1164 прадукцыйныя свінаматкі ў Клімавіцкім раёне.

Вынік мог быць некалькі вышэй, але ў аднолькавых умовах не ўсе раёны змаглі паказаць неабходны вынік.

— За апошнія тры гады з'явілася шмат новых турыстычных маршрутаў па раёнах вобласці, развіваецца аграгурыстычны бізнес, з'яўляюцца новыя турыстычныя аб'екты. Наколькі ўсё гэта важна?

— У душы я заўсёды быў вясковым чалавекам, мае карані на Случчыне. Добра памятаю духмяны водар хатняга хлеба, смажанага сала і ні з чым не параўнальную калодзежную ваду. Гэта не настальгія па маленстве, а звычайная памяць сэрца. Лічу, што паняцце «малая радзіма» для ўсіх аднолькавае. І тое, што сёння мы гэтаму аддаём так шмат увагі, цалкам натуральна і правільна. Пра свае карані трэба памятаць.

Апошнім часам шмат зроблена для развіцця ўнутранага турызму. Сёлета ў Магілёўскай вобласці распрацаваны новыя турыстычныя маршруты патрыятычнай накіраванасці — «Купальскае кальцо» з праездам па малой радзіме першага беларускага Прэзідэнта, «Таямніцы блакітнай крыніцы», «Край белых начэй» і іншыя. Стала больш самастойных турыстаў, якія даволі актыўна наведвалі музеі вобласці і аграсядзібы.

А вось што датычыцца візітаў да нас замежнікаў, то іх паток сёлета паменшыўся больш чым у тры разы. У красавіку—жніўні візіты замежных турыстаў былі практычна зведзены да нуля, паколькі шмат якія краіны закрылі свае межы. У выніку значна ўпала загрузка гасцініц, санаторыяў і турыстычных баз.

Для пераадолення эканамічных наступстваў пандэміі ажыццяўляецца падтрымка суб'ектаў гаспадарання ў турыстычнай сферы ў адпаведнасці з нормамі Указаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №№ 178 і 143. Напрыклад, прадпрыемства «Магілёўаблтурыст» атрымала субсідыю для ажыццяўлення даплат работнікам да велічыні мінімальнай заработнай платы і выплаты абавязковых страхавых узносаў. У дачыненні да суб'ектаў турыстычнага бізнесу прынята рашэнне аб памяншэнні сумы падатку на нерухомасць і зямельнага падатку.

— Мы ўвесь час змагаемся за чысціню навакольнага асяроддзя, заклікаем берагчы экалогію. Але ўтылізацыя бытавых адходаў — гэта наш біч, які наносіць прыродзе вялікую шкоду. Як можна вырашыць праблему і што для гэтага робіцца ў вобласці?

— Год таму Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь зацвердзіў Канцэпцыю стварэння аб'ектаў па сартаванні і выкарыстанні цвёрдых камунальных адходаў і палігонаў для іх захавання. У адпаведнасці з гэтай канцэпцыяй на тэрыторыі Магілёўскай вобласці прадугледжана стварэнне трох рэгіянальных аб'ектаў з Магілёўскай, Бабруйскай і Крычаўскай зонамі абслугоўвання. Работа ў гэтым кірунку вядзецца, вызначаны адказныя арганізацыі, распрацоўваюцца рэгіянальныя схемы абыходжання з цвёрдымі камунальнымі адходамі. У наступным годзе пачынаецца будаўніцтва смеццеперапрацоўчага завода для Бабруйска.

Адначасова вядзецца работа з насельніцтвам. Людзі павінны разумець важнасць раздзельнага збору бытавых адходаў.

— Прыёмы грамадзян, прамыя тэлефонныя лініі, сустрэчы з працоўнымі калектывамі дапамагаюць найбольш дакладна меркаваць пра тое, што турбуе насельніцтва, якімі клопатамі яно жыве. Што сёння больш за ўсё актуальна для жыхароў вобласці, як вырашаюцца іх праблемы?

— Кіраўніку любога ўзроўню важна мець зносіны з насельніцтвам наўпрост, без пасрэднікаў. Гэтым летам я вырашыў праехаць па ўсіх раёнах вобласці і правесці сустрэчы з жыхарамі. Людзі былі адкрытыя, казалі аб праблемах і, што асабліва прыемна, адзначалі пазітыўныя моманты ў жыцці іх раёнаў.

Пытанні паступаюць розныя, у асноўным звязаныя з камунальнай гаспадаркай, гандлем, аховай здароўя, будаўніцтвам, рамонтам аб'ектаў сацыяльнай сферы. Нешта атрымліваецца вырашаць у аператыўным парадку. Так былі адкрыты крамы ў аграгарадку Міхалёва Магілёўскага раёна і вёсцы Брожа Бабруйскага, выкананы капітальны рамонт моста ў Быхаве, набыты аўтамабіль хуткай медыцынскай дапамогі для Крычаўскай цэнтральнай раённай бальніцы, уведзена ў эксплуатацыю станцыя абезжалезвання ў аграгарадку Сухары.

У наступным годзе мы плануем пачаць рамонтныя або будаўнічыя работы на шэрагу важных сацыяльных аб'ектаў, на якія звярнулі ўвагу жыхары Магілёўскай вобласці. Напрыклад, намечана будаўніцтва басейна ў Хоцімску.

На жаль, даводзіцца вырашаць пытанні, якія павінны здымацца на мясцовых узроўнях. І ў гэтым вялікая недапрацоўка тамтэйшай улады. Уладкаванне пандуса для інвалідаў або змяненне графіка руху грамадскага транспарту — праблемы, здавалася б, нязначныя, але вельмі важныя для людзей. І ўлада павінна рэагаваць.

— Год заканчваецца, а разам з ім і трохгоддзе малой радзімы. Але кірунак на паляпшэнне дабрабыту грамадзян, сацыяльную стабільнасць застаецца. Падзяліцеся, калі ласка, планамі на наступны год.

— Асноўныя намаганні будуць сканцэнтраваны на ўмацаванні эканомікі за кошт такіх фактараў, як рост экспарту, інвестыцый, павышэння эфектыўнасці работы арганізацый рэальнага сектара эканомікі. Мы распрацоўваем комплекс мер, рэалізацыя якіх дазволіць павялічыць даходы мясцовых бюджэтаў на 7,9 % да ўзроўню 2020 года, павысіць намінальную налічаную сярэднямесячную заработную плату на 7,6 %, нарасціць аб'ём інвестыцый у асноўны капітал да 2,4 мільярда рублёў. Гэта даволі амбіцыйныя планы, але яны выканальныя. У гэтым я глыбока перакананы.

У нас ёсць праблемы. Але я неаднаразова казаў: усе нашы праблемы вырашальныя — у мірнай, спакойнай, кіруемай краіне. Такой, як наша Беларусь.

— Леанід Канстанцінавіч, работа адымае ў вас шмат часу. Пастаянныя сустрэчы, перагаворы, паездкі, нарады і ў будні, і ў выхадныя дні. Як у вас хапае сіл на работу 24 гадзіны ў суткі?

— Гэта, вядома, перабольшанне: 24 гадзіны ў суткі працаваць немагчыма. Я таксама адпачываю. Разам з жонкай Алай Васілеўнай па меры магчымасці наведваем тэатр, ходзім на канцэрты, аднойчы нават атрымалася трапіць на футбол. Калі ёсць час, люблю пачытаць. Апошняя з прачытаных кніг — «Астравы памяці». Чатыры беларускія аўтары — Лідзія Ачыновіч, Вячаслаў Баршчэўскі, Анатоль Стаскевіч і Ала Суднік — напісалі пра герояў Вялікай Айчыннай вайны, партызанаў, якія змагаліся ў тыле ворага на тэрыторыі Клічаўскага раёна. Рэкамендую гэтую кнігу ўсім, асабліва моладзі. Твор заснаваны на ўспамінах людзей, якія прайшлі вайну, многае перажылі і праз усё жыццё пранеслі памяць аб сваіх баявых таварышах і сябрах.

Адпачынак з кнігай, з сям'ёй лічу самым карысным, але, калі шчыра, цалкам адключыцца ад работы ўсё ж не атрымліваецца. Адказваць за цэлую вобласць — гэта вельмі сур'ёзна. Кіраўнік дзяржавы накіраваў мяне сюды, паставіў задачы, і я не маю права, не магу падвесці ні Прэзідэнта, ні жыхароў вобласці.

Мост праз раку Сож злучыў Краснапольскі і Слаўгарадскі раёны і адкрыў кароткі шлях да знакамітай Блакітнай крыніцы.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота tribunapracy.by, ctv.by, dzyannica.by і іншых адкрытых крыніц.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 19 января 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

Предмет торгов
Капитальное строение с инвентарным номером 600/С-130521 общей площадью 1862,8 кв. м (наименование: здание производственной базы; назначение: здание многофункциональное; составные части и принадлежности: трехэтажное из ж/б панелей и кирпича здание производственной базы); капитальное строение с инвентарным номером 600/С-165694 общей площадью 717,1 кв. м (наименование: склад-навес; назначение: сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: склад-навес А, площадка а1, ограждение а2, сеть электроснабжения Б, сеть водоснабжения В)
Сведения о земельном участке: площадь – 1,2993 га, кадастровый номер – 623650100001002871
Местонахождение: Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Загородная, 1В, 1В/1
Начальная цена: 1 885 851,00 бел. руб. без учета НДС
Сумма задатка: 188 000,00 бел. руб.

Продавец имущества: ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

Условие торгов: Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **19 января 2021 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 29.12.2020 по 15.01.2021 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).

Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества
ОАО «Ивацевичдрев»

Предмет торгов – Лот: капитальное строение с инвентарным номером 122/С-15464 (наименование: столовая; назначение: здание специализированное для общественного питания) площадью 221,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. Гойшика, д. 33, на земельном участке с кадастровым номером 123450100001003706, площадью 0,1910 га.
Составные части и принадлежности: основная пристройка

Начальная цена, руб. (без учета НДС)	16 300,00	Размер задатка, руб.	1 630,00

Продавец: ОАО «Ивацевичдрев» 225295, Брестская обл., г. Ивацевичи, ул. Загородная, 2.
Организатор торгов: Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».
Р/с для перечисления задатка: BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича, 10, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245.
Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 5 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.
Условия оплаты: в соответствии с заключенным договором купли-продажи.
Условия продажи: без условий.
Информация о возмещении затрат: участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также вознаграждение Организатору аукциона.
Шаг аукциона: 15 % от предыдущей названной цены

Аукцион состоится 14 января 2021 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

Последний день приема заявлений – 13 января 2021 г. до 17.00

Ранее извещение о продаже имущества ОАО «Ивацевичдрев» было опубликовано в газете «Звязда» от 21.11.2020

05.01.2021 г. в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня:
1) Об использовании чистой прибыли прошлых лет.
2) О совершении сделок общества.
Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой»: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.
Место проведения собрания: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.
Время регистрации в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.
При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность). Дата сбора реестра акционеров – 01.01.2021 г.
С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 28.12.2020 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Наблюдательный совет.

УНП 200050191

Извещение о проведении 29 января 2021 года аукционных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС»

Сведения о продаваемом имуществе

№ предмета торгов	Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества	Сведения о земельном участке	Начальная цена, бел. руб., с учетом НДС	Размер задатка, бел. руб.
1	Капитальное строение с инв. номером 500/С-55262 общей площадью 246,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Брест-Литовская, 4, наименование – здание склада, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,0436 га, кадастровый номер – 500000000004003344	182 400,0	18 000,0
2	Капитальное строение с инв. номером 500/С-60246 общей площадью 320,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Брест-Литовская, 4/2, наименование – здание склада, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,0449 га, кадастровый номер – 500000000004005034	169 200,0	16 000,0
3	Капитальное строение с инв. номером 630/С-65814 общей площадью 94,9 кв. м (наименование – бухгалтерия-склад, назначение – здание неустановленного назначения, составные части и принадлежности – кирпичная холодная пристройка, два склада-холодильника, пять дощатых сараев); капитальное строение с инв. номером 630/С-65813 общей площадью 122,8 кв. м (наименование – кондитерский цех, назначение – здание неустановленного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-65811 общей площадью 157,6 кв. м (наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); капитальное строение с инв. номером 630/С-65816 общей площадью 42,0 кв. м (наименование – административное здание, назначение – здание административно-хозяйственное), расположенные по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Вокзальная, 4, и капитальное строение с инв. номером 630/С-79669 протяженностью подземной прокладки 4,10 м (наименование – водопроводные сети, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, составные части и принадлежности – здания, сооружения, оборудование согласно техническому паспорту б/н от 17.07.2019 года, составленного по состоянию на 10.07.2019 года), расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Вокзальная	Площадь – 0,1382 га, кадастровый номер 623850100003001899	32 659,47	3 200,00
4	Капитальное строение с инв. номером 622/С-42668 общей площадью 104,4 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Столбцовский р-н, г. Столбцы, ул. Товарная, 27, наименование – здание магазина № 85, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – целое одноэтажное кирпичное здание магазина № 85 А1/к с крыльцом а, бетонным покрытием б, металлическими воротами в	Площадь – 0,0232 га, кадастровый номер 625450100001003768	37 968,0	3 700,0
5	Капитальное строение с инв. номером 640/С-68377 общей площадью 337,9 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Ленина, 94А, наименование – торгово-производственный комплекс, назначение – здание многофункциональное, составные части и принадлежности – торгово-производственный комплекс А1/к с двумя пристройками 1, 2, складом 3, дорожка а, дворовое покрытие б, калитка в, ворота г, забор д	Площадь – 0,2462 га, кадастровый номер 642500000001000231	329 712,0	32 000,0
6	Капитальное строение с инв. номером 412/С-14444 общей площадью 285,1 кв. м (наименование – кирпичное одноэтажное здание магазина № 12, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – две кирпичные пристройки, терраса), капитальное строение с инв. номером 412/С-14445 общей площадью 65,4 кв. м (наименование – одноэтажное кирпичное здание склада, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), расположенные по адресу: Гродненская обл., Мостовский р-н, г. Мосты, ул. Станционная, д. 4	Площадь – 0,1505 га, кадастровый номер – 424050100005000002	57 700,0	5 700,0
7	Капитальное строение с инвентарным номером 633/С-10565 общей площадью 66,3 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Мядельский р-н, Будславский с/с, п. Будслав, наименование – магазин № 50, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – здание бревенчатое, облицованное кирпичом	Площадь – 0,0395 га, кадастровый номер 624080602101000023	9 240,0	920,0
8	Капитальное строение с инв. номером 633/С-10564 общей площадью 64,1 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Мядельский р-н, Княгининский с/с, аг. Княгинин, ул. Привокзальная, д. 81, наименование – магазин № 42, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – кирпичное здание магазина, два кирпичных склада	Площадь – 0,0379 га, кадастровый номер 624082004601000184	11 640,0	1 100,0
9	Капитальное строение с инв. номером 630/С-41447 общей площадью 304,8 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Олехновичский с/с, аг. Олехновичи, ул. Молодежная, 2, наименование – одноэтажный кирпичный магазин, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – кирпичная рампа с навесом	Площадь – 0,0672 га, кадастровый номер 623883004601000103	86 500, 0	8 600,0
10	Капитальное строение с инв. номером 240/С-28899 общей площадью 2 162,8 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Мира, 71А, наименование – здание магазина № 43, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – подвал; капитальное строение с инв. номером 240/С-29803 протяженностью 165 м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Мира, 71, наименование – электрические сети, назначение – сооружение специализированное энергетики электрические сети к магазину № 43, составные части и принадлежности – электрические сети (участок кабеля подземного 0,4 кВВ от ТП-284 до ввода в магазин, участок кабеля подземного 0,4 к.В. от ввода в здание магазина до щитовой магазина, участок кабеля подземного 0,4 кВ от щитовой жилого дома до ввода в здание магазина, участок кабеля подземного 0,4 к.В от ввода в здание магазина до щитовой магазина)	Площадь – 0,1949 га, кадастровый номер 242400000001004376	73 153,60	7 300,0
11	Изолированное помещение* с инв. номером по бухгалтерскому учету 088554 общей площадью 169,2 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Станционная, 1-17, наименование – торговое помещение, назначение – торговое помещение	-	42 260,0	4 200,0
12	Капитальное строение с инв. номером 240/С-45976 общей площадью 115,9 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Межевский с/с, аг. Заполье, ул. Станционная, 2, наименование – здание магазина № 61, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – электрические сети; капитальное строение* с инв. номером по бухгалтерскому учету 084792 общей площадью 22,0 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Межевский с/с, аг. Заполье, ул. Станционная, 2/1, наименование – здание склада	Площадь – 0,0370 га, кадастровый номер 223684400001000005	3 653,78	360,0

* Согласно подпункту 9.1 пункта 9 Указа Президента Республики Беларусь от 31.12.2018 № 506 «О развитии Оршанского района Витебской области», отчуждение расположенных на территории Оршанского района объектов недвижимого имущества, находящихся в государственной собственности и собственности юридических лиц, более 50 процентов акций (долей в уставных фондах) которых находится в государственной собственности, либо входящих в состав холдингов с участием государства, может осуществляться без наличия технических паспортов, а также документов, удостоверяющих государственную регистрацию прав на данное имущество

Условия торгов: победитель торгов (покупатель) в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона:
по предметам торгов №№ 1, 2 в размере 1,0 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов;
по предмету торгов №№ 3, 4, 5 в размере 3,0 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов;
по предметам торгов №№ 6–12 в размере 2,0 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов.

Продавец имущества: ОАО «ДОРОРС», ул. Брестская, 77/1-2, 220099, г. Минск.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток (задатки) и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» р/с BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах от 29.01.2021 по предмету торгов № _ _.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **29 января 2021 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 29.12.2020 по 27.01.2021** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону (017) 240-62-06.

Телефоны для справок: (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 240-62-06 (ОАО «ДОРОРС»).

ДЗЯСЯТЫ ВАЛ

Да чаго прывяла «арабская вясна»?

Дзесяць гадоў таму — у снежні 2010-га — на Блізкім Усходзе і ў Паўночнай Афрыцы пачалася «арабская вясна». Хваля маштабных пратэстаў, якая пракацілася па краінах стратэгічнай у сусветным геапалітычным раскладзе тэрыторыі, вельмі хутка перарасла ў масавыя беспарадкі і ўзброенае супрацьстаянне з паліцыяй і войскам. Далейшыя трагічныя падзеі перайначылі палітычны, грамадскі і нават рэлігійны ландшафт рэгіёна, адзначае lenta.ru. Пры гэтым сённяшнія рэаліі зусім не аптымістычныя: за дзесяць гадоў мясцовыя жыхары аб'ектыўна сталі жыць горш. Да чаго ж прывяла «арабская вясна»?

КРЫЗІС ЗА КРЫЗІСАМ

17 снежня 2010 года ў туніскім горадзе Сідзі-Бузід 26-гадовы мужчына падышоў да будынка адміністрацыі. З сабой у яго былі каністра з бензінам і запалкі. Ён выліў на сябе бензін і дастаў запалкі са словамі: «Як, па-вашаму, я магу зарабіць на жыццё?» Гэта быў Махамед Буазізі, гандляр садавіной. Прычынай яго ўчынку паслужыў канфлікт з мясцовымі чыноўнікамі, якія патрабавалі ў яго хабар за права гандляваць з латка гароднінай і садавіной.

Інцыдэнт выклікаў масавыя пратэсты супраць нізкага ўзроўню жыцця і карупцыі. Пратэсты ў Тунісе прывялі да найбольш значных перамен. Ужо 14 студзеня 2011 года прэзідэнт адправіў урад у адстаўку і прызначыў датэрміновыя парламенцкія выбары, абвясціўшы, што не будзе балаціравацца. Крыху пазней у той жа дзень ён пакінуў краіну.

Пратэсты ў Тунісе выклікалі эфект даміно і хутка перакінуліся на іншыя краіны арабскага свету. На вуліцы сваіх гарадоў выходзілі жыхары Алжыра, Лівіі, Емена, Егіпта, Марока і Бахрэйна, хваля маніфестацый пракацілася нават па Амане, Судане, Кувейце, Заходняй Сахары, Саудаўскай Аравіі і неарабскім Іране.

Аднак за дзесяцігоддзе відавочна прафесійна зрэжысіраваную эйфарыю змяніла расчараванне. Замест веры ва ўласныя сілы і надзеі на перамены да лепшага жыхары закранутых «вясной» краін атрымалі рост нестабільнасці, экстрэмізму і тэрарызму, зацяжныя ўзброеныя канфлікты і мільёны бежанцаў. Як заўважыў lenta.ru прафесар Каліфарнійскага ўніверсітэта Джэймс Гелвін, за апошнія 10 гадоў рэгіён перажываў адзін гуманітарны крызіс за другім. «У зонах самых разлютаваных баявых дзеянняў — Сірыі, Лівіі, Емене, Іраку — гарады і пасёлкі былі закінутыя, а іх насельніцтва бегла ў розныя бакі. Рэзка ўзрасла колькасць унутрана перамешчаных асоб і бежанцаў. Вайна і грамадзянскія беспарадкі не толькі прывялі да ахвяр сярод насельніцтва, але і разбурылі інфраструктуру коштам у мільярды долараў, падарвалі сістэму грамадскай аховы здароўя», — падкрэсліў Гелвін. Такім чынам, пастаянная пагроза жыццям мільёнаў людзей — масавы голад, «які з'яўляецца адначасова вынікам і прыладай вайны», дадаў эксперт.

ЯК НА ВУЛКАНЕ

Большасць жыхароў краін, якіх у значнай ступені закранула «арабская вясна», сёння лічаць, што жывуць пры мацнейшай сацыяльнай няроўнасці, чым да хвалі пратэстаў. Гэта вынікае з апытання, праведзенага YouGov па замове The Guardian у васьмі краінах, якія ў большай ці меншай ступені закранула хваля беспарадкаў (Судан, Туніс, Алжыр, Ірак, Егіпет, Лівія, Сірыя і Емен). Роўна ў палове з іх працягваюцца ўзброеныя канфлікты, а эканоміка разбурана.

Большасць рэспандэнтаў Сірыі (75 працэнтаў), Емена (73 працэнта) і Лівіі (60 працэнтаў) адказалі, што цяпер знаходзяцца ў горшым становішчы, чым да 2011 года. У Егіпце і Алжыры каля траціны грамадзян думаюць, што сітуацыя не змянілася.

Нават у Тунісе, які бачаць ледзьве не «гісторыяй поспеху», пануе глыбокае расчараванне. Палова жыхароў гэтай краіны лічаць, што іх становішча стала дрэнным. Аднак узровень беднасці застаецца высокім, беспрацоўе дасягае 15 працэнтаў, а дзяржаўны доўг падвоіўся. Не ўдалося выкараніць карупцыю і абуральную сацыяльную няроўнасць. 10-годдзе сваёй рэвалюцыі тунісцы адзначаюць маршамі пратэсту і забастоўкамі. Каля шасці тысяч чалавек раней выехалі ў Ірак і Сірыю, каб далучыцца да тэрарыстычнай групоўкі «Ісламская дзяржава».

Рознагалоссі паміж свецкімі і рэлігійныя партыямі вядуць да палітычнай нестабільнасці і міністэрскай мітусні. Грамадзяне вінавацяць палітычную эліту ў няздольнасці або нежаданні заняцца справай. «Туніс сядзіць на вулкане, які невядома, калі выбухне», — напісаў напярэдадні юбілею ў штотыднёвіку Arab Weekly мясцовы эканаміст Хашэмі Алай.

Дарэчы, ва ўсіх васьмі краінах большасць мясцовых жыхароў не спадзяецца на лепшую будучыню для сваіх дзяцей, а ў Сірыі і Емене песімісты колькасна пераўзыходзяць аптымістаў прыкладна ў дзесяць разоў. Большасць сцвярджае, што разрыў паміж багатымі і беднымі за апошнія 10 гадоў павялічыўся. У Сірыі так лічыць 92 %, у Емене — 87 % апытаных.

РАДЫКАЛЫ І КАРУПЦЫЯ

Адзіным «значным вынікам» «арабскай вясны» стала ўзмацненне пазіцыі радыкальных ісламістаў, адзначыў gazeta.ru прэзідэнт расійскага Інстытута Блізкага Усходу Яўген Сатаноўскі. «Гэта адбылося, напрыклад, у Егіпце, Сірыі, Лівіі і Емене. Менавіта ў ходзе «арабскай вясны» пра сябе заявілі сілы, што найбольш радыкальным чынам аспрэчваюць статус-кво, які існуе ў рэгіёне — «Ісламская дзяржава» і курды. Яна прывяла да ўлады ісламістаў. Дзесьці надоўга, як у Тунісе, хоць яны не манапалізавалі ўладу, дзесьці на год, як у Егіпце, дзесьці разбурыла дэ-факта краіну — у Емене сапернікамі Салеха былі ісламісты. Ніколі мяцяжы, бунты, перавароты, у якіх выйграюць ісламісты, не прыводзяць да паляпшэння ні для каго, акрамя іх», — адзначыў эксперт.

Больш за тое, пратэсты абрынулі эканоміку. Па падліках Міжнароднага валютнага фонду, страты краін, якія ўдзельнічалі ў канфліктах, склалі больш чым 55 мільярдаў долараў. Пры гэтым страчаны эканамічны рост за перыяд з 2011 года перавысіў $614 млрд. Яшчэ адным вынікам «арабскай вясны» стаў паток бежанцаў, якія рванулі ў Еўропу. Міграцыйны крызіс, з якім сутыкнуўся Еўрасаюз, да гэтага часу не вырашаны.

Даследаванне грамадскай думкі, якое ў кастрычніку правёў Арабскі цэнтр даследавання палітыкі, стала найбуйнейшым у гісторыі Блізкага Усходу. 900 сацыёлагам спатрэбілася амаль 70 тысяч гадзін працоўнага часу, усяго яны праехалі 820 тысяч кіламетраў, каб апытаць 30 тысяч чалавек у 13 краінах — у Маўрытаніі, Марока, Алжыры, Тунісе, Егіпце, Судане, Палесціне, Ліване, Іарданіі, Іраку, Саудаўскай Аравіі, Кувейце і Катары. Паводле даных цэнтра, 91 працэнт апытаных лічыць, што ў іх краінах высокая карупцыя.

МОЛАДЗЬ БЕЗ РАБОТЫ

У дзясятую гадавіну пачатку «арабскай вясны» эксперты Савета па міжнародных адносінах (Council on Foreign Relations, CFR — самая магутная прыватная арганізацыя па ўплыве на знешнюю палітыку ЗША) правялі параўнанне эвалюцыі краін арабскага свету да і пасля гэтых падзей. Высновы несуцяшальныя — паўстанні прывялі да жахлівага і працяглага гвалту, масавай міграцыі і абвастрэння рэпрэсій у некаторых частках рэгіёна.

Ніякага ўстойлівага прагрэсу ў краінах, ахопленых пратэстамі «арабскай вясны», па даных CFR, не адбылося. Савет спасылаецца на «індэксы дэмакратыі» іншай амерыканскай ліберальнай структуры — Freedom House. Гэта ангажаваная крыніца, якая тым не менш прызнаецца, што свабода прэсы ў рэгіёне сёння горшая, чым у гады да паўстанняў.

«Арабская вясна», адзначае CFR, прывяла да істотнага зніжэння ўзроўню жыцця, перш за ўсё ў ахопленых вайной Сірыі, Лівіі і Емене. Надзеі моладзі, якая была адным з рухавікоў пратэстаў, на паляпшэнне свайго становішча не апраўдаліся: «Беспрацоўе сярод моладзі ў рэгіёне застаецца самым высокім у свеце і абвастрылася ў шэрагу краін, у некаторых выпадках распальваючы [новыя] пратэсты», — адзначаюць эксперты.

Карупцыя, супраць якой выступалі пратэстоўцы, нікуды не падзелася. Больш за тое, даныя Сусветнага банка сведчаць аб тым, што сітуацыя і ў гэтай сферы пагоршылася. У многіх выпадках замежнае ваеннае ўмяшанне ўзмацніла гвалт і беспарадкі, адзначае CFR. Колькасць бежанцаў з Сірыі і ўнутрана перамешчаных асоб у мінулым годзе склала амаль 13 мільёнаў чалавек, з Емена — 3,7 мільёна, з Лівіі — каля 400 тысяч.

У ПРАДЧУВАННІ ХВАЛІ 2.0

Як заўважыў колішні пасол Вялікабрытаніі ў Сірыі і Бахрэйне Пітэр Форд, «арабская вясна» выдахлася яшчэ ў 2014 годзе — калі тыя, хто выйшаў на вуліцы, спалохаліся таго, што зрабілі. Але цяпер ужо трэба казаць аб сезоне больш страшным — «арабскай зіме». Людзі сталі жыць горш — і яны зноў выходзяць на дэманстрацыі. І зноў будуць забіваць адзін аднаго».

«Дэмакратыя прадугледжвае эвалюцыйны шлях развіцця, а не гвалтоўную змену ўлады і грамадскага ладу. Пераўтварэнні павінны натуральна абнавіць краіну. У той час як «арабская вясна» — гэта кантраляванае падрыванне дзяржаўнага ўнутры, якое прывяло да жахлівага ўзрушэння», — заўважыў riafan.ru эксперт расійскай Асацыяцыі ваенных палітолагаў Андрэй Кошкін.

Прычым разбуральная хваля зноў набірае моц. «Праз дзесяць гадоў людзі па ўсім рэгіёне ўсё яшчэ падпальваюць сябе ў знак пратэсту: ад Судана да Лівана і Егіпта. Умовы, якія справакавалі паўстанні ў арабскіх краінах, у тым ліку карупцыя, крах эканомікі і пагаршэнне ў сферы сацыяльных паслуг, толькі ўзмацніліся ў многіх краінах, яны ўскладніліся пандэміяй. Паўсюдная няздольнасць рэгіянальных урадаў ліквідаваць гэтыя першапрычыны прывяла да «арабскай вясны 2.0»: новага вітка паўстанняў, падчас якіх пратэстоўцы патрабуюць паляпшэння якасці жыцця», — адзначыла рэдактар Middle East Eye Меган О'Тул.

У мінулым годзе ў рэгіёне пракацілася другая хваля пратэстаў. Аднак COVID-19 фактычна паставіў на паўзу пратэсныя рухі, якія зноў пачалі набіраць абароты ў рэгіёне. Нягледзячы на «каранавірусную паўзу» ў пратэстах, пандэмія, дакладней, справакаваны ёю беспрэцэдэнтны эканамічны крызіс, можа стаць яшчэ адным каталізатарам рэвалюцый на Блізкім Усходзе. Як лічыць прафесар Ашкар з Лонданскага ўніверсітэта, ковід стварыў яшчэ больш спрыяльнае асяроддзе для сацыяльнага выбуху. «Пацярпелі нават багатыя арабскія краіны, чыя эканоміка моцна залежыць ад экспарту нафты, цэны на якую ўпалі, — падкрэсліў эксперт. — Значыць, эканамічная і сацыяльная сітуацыя сталі яшчэ больш напружаныя». Рэгіён зноў у прадчуванні ўзрушэнняў.

Захар БУРАК.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. Вы нарэшце адчуеце сілу для новых здзяйсненняў, гэта дазволіць завяршыць год на пазітыве і паспець вырашыць мноства пытанняў і перарабіць шмат спраў. Багацце ідэй дапаможа праявіць сябе ў якасці лідара, раскрыць свае арганізатарскія здольнасці. Тыдзень будзе насычаны кантактамі, сустрэчамі і падзеямі. У святы абавязкова знайдзіце час для старых сяброў.

ЦЯЛЕЦ. Паспрабуйце не планаваць вырашэнне сур'ёзных пытанняў на першую палову тыдня, усё роўна ў галаве ва ўсіх ужо падарункі і святы. Памятайце, што залішняя ўпартасць і імкненне дамінаваць прывядуць толькі да сварак і канфліктаў. Каб здабыць упэўненасць ва ўласных сілах, не абавязкова спяшацца і мітусіцца, засяродзьцеся — і ўсё атрымаецца. У канцы тыдня нарэшце з'явіцца магчымасць адпачыць. І пажадана гэта рабіць актыўна, а не проста лежачы на канапе.

БЛІЗНЯТЫ. Перастаньце ўвесь час параўноўваць сябе з навакольнымі, у вас таксама ўсё выдатна, а будзе яшчэ лепш. Усе жаданні, якія вы загадаеце ў навагоднюю ноч, абавязкова спраўдзяцца, прычым вельмі хутка. Каханы чалавек зробіць самы лепшы падарунак. Вы адзначыце свята ў выдатнай кампаніі. І зразумееце, што жыццё поўнае радасці, любові і вялікіх магчымасцяў.

РАК. Прыйшоў час прааналізаваць, ці абгрунтаваныя патрабаванні, якія вы прад'яўляеце да сабе і навакольных. Аўторак можа апынуцца вельмі мітуслівым днём, ад вас спатрэбіцца актыўнасць, затое з'явіцца цудоўная магчымасць рэалізаваць творчыя здольнасці. У сераду варта кантраляваць раздражненне і не правакаваць канфліктаў. Стварыце сабе і блізкім святочны настрой. У выхадныя дні займіцеся чым-небудзь карысным.

ЛЕЎ. Вы поўныя сіл і энтузіязму. Ініцыятыва і прадпрымальнасць нададуць размаху ў справах. Зараз закладваюцца праекты, якія прывядуць да поспеху. Пажадана не паўтараць сваіх памылак, пакіньце іх у годзе, які сыходзіць. Паспрабуйце зрабіць так, каб навакольныя ўбачылі вынікі вашай дзейнасці, а не абвінавачвалі вас у яе імітацыі. Цяга да прыгод і падарожжаў будзе моцная, вам будзе складана ўседзець на адным месцы. Паездкі могуць завяршыцца цікавым знаёмствам. Субота выдатна падыходзіць для новай справы або пачатку ўвасаблення вашых ідэй.

ДЗЕВА. На гэтым тыдні планавыя мерапрыемствы могуць сарвацца, але тое, што будзе атрымлівацца спантанна, пройдзе выдатна. І размова ў тым ліку і пра навагоднюю ноч. Вас могуць ашчаслівіць сваім з'яўленнем сябры. У пятніцу вашы планы будуць мяняцца сто разоў на дзень, у залежнасці ад настрою блізкіх людзей. Субота добрая для роздумаў і чытання філасофскай літаратуры.

ШАЛІ. На гэтым тыдні неабходна паказаць сябе, ды так, каб вас заўважылі і падтрымалі тыя, ад каго вы маглі б атрымаць дапамогу ў найбліжэйшы час. У панядзелак не саромейцеся карэктна падкрэсліць вашу незаменнасць на рабоце. У аўторак актывізуйце ўсе свае рэсурсы таварыскасці, вам будзе патрэбна інфармацыя, найлепшы спосаб яе атрымаць — шчыра пагаварыць з калегамі. У сераду не варта планаваць нічога сур'ёзнага, займіцеся падрыхтоўкай да свята. У навагоднюю ноч весяліцеся і прымайце віншаванні.

СКАРПІЁН. Вы адчуеце пазітыўныя перамены ў прафесійнай сферы і ў асабістым жыцці. Новы год трэба сустракаць з тымі, хто вам сапраўды дарагі. Пакіньце ў адыходзячым годзе ўсе праблемы і адносіны, якія зжылі сябе. Прызнайцеся ў каханні, зрабіце штосьці рамантычнае. У навагоднюю ноч верагодна шмат прыемных сюрпрызаў, так што настрой будзе выдатны.

СТРАЛЕЦ. На гэтым тыдні не варта губляць час дарма. Не спыняйцеся на дасягнутым, смела перасковайце праз чарговую планку. Нават калі вы дамасед, не варта адмаўляцца ад запрашэння сяброў або ад шумнай вечарынкі. Вы выдатна праведзяце час. У пятніцу даверцеся парадам сяброў, яны растлумачаць тонкія нюансы ў наспеўшай праблеме. У суботу шанцы для ажыццяўлення планаў як ніколі вялікія.

КАЗЯРОГ. Ваш дэвіз — больш слухайце і менш гаварыце. Давядзецца заклікаць на дапамогу інтуіцыю і мудрасць. Неабходная гнуткасць у зменлівых сітуацыях, вучыцеся імі кіраваць. Улічваючы інтарэсы блізкіх людзей, атрымаеце магчымасць рэалізаваць вашы намеры і задумы і выдатна сустрэнеце Новы год. Дазвольце сабе доўгачаканы адпачынак і не адмаўляйцеся ад запрашэнняў сяброў.

ВАДАЛІЙ. На гэтым тыдні з завоблачных вышынь давядзецца спусціцца хоць бы на адну прыступку. Чым бліжэй да зямных спраў вы будзеце, тым больш шанцаў на поспех у рэальнасці, а не ва ўяўленні. У панядзелак не варта займаць актыўную пазіцыю ў спрэчцы, лепш наогул пастарацца ад яе сысці. Не забудзьцеся павіншаваць са святам даўніх сяброў. У навагоднюю ноч можа збыцца важнае жаданне. У нядзелю добра будуць атрымлівацца спантанныя дзеянні, так што ў гэты дзень варта паддацца раптоўнаму парыву і куды-небудзь паехаць.

РЫБЫ. Паспрабуйце пачаць ажыццяўляць задуманае, яно таго вартае. Пачынайце дзейнічаць, для сумненняў не засталося часу. Прысвяціце дому і блізкім людзям больш увагі, гэта дазволіць і ім праявіць сваю любоў да вас. Не забывайце, што Новы год — сямейнае свята. Будзьце мудрыя, кантралюйце свае эмоцыі, рэгулюйце дозы, а то наступствы могуць быць дастаткова непрадказальныя.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.29	16.54	7.25
Віцебск —	9.26	16.36	7.10
Магілёў —	9.19	16.44	7.25
Гомель —	9.07	16.49	7.42
Гродна —	9.42	17.11	7.29
Брэст —	9.34	17.20	7.46

Месяц

Першая квадра 22 снежня.
Месяц у сузор'і Блізнят.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Васіля, Паўла, Сцяпана, Трыфана.*
К. *Эмы, Антона, Цэзара.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

28 СНЕЖНЯ

У краіне

1900 год — нарадзіўся (цяпер. Шаркаўшчына) Павел Міхайлавіч Верхаловіч, генерал-лейтэнант, кандыдат ваенных навук. У Чырвонай Арміі з 1919-га. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны (1939—1940). У Вялікую Айчынную вайну на Заходнім, Данскім, Сцяпным, Варонежскім і 2-м Украінскім франтах: начальнік штаба 49-й, 24-й, 57-й армій. Удзельнік абароны Масквы, Сталінградскай бітвы, Корсунь-Шаўчэнкаўскай аперацыі, вызвалення Балгарыі, Югаславіі, Румыніі, Венгрыі. Пасля вайны выкладаў у Ваеннай акадэміі Генштаба.

1910 год — нарадзіўся Іван Браніслававіч Шаціла, акцёр, народны артыст БССР. У 1932—1961-м, 1967—1971 гадах працаваў у Беларускім тэатры імя Янкі Купалы, у 1961—1967 гадах — у Дзяржаўным рускім драматычным тэатры Беларусі. Удзельнічаў у радыёпастаноўках на Беларускім радыё. Здымаўся ў фільмах «Пяюць жаваранкі», «Першыя выпрабаванні», «Вуліца малодшага сына», «Масква—Генуя».

1850 год — нарадзіўся Францэска Таманьё, італьянскі спявак (тэнар). Адзін з найлепшых тэнараў сусветнай опернай сцэны, бліскучы выканаўца гераіка-драматычных партый у операх Вердзі. Першы выканаўца партыі Атэла ў аднайменнай оперы.

У свеце

1885 год — нарадзіўся Уладзімір Яўграфавіч Татлін, рускі жывапісец, графік, мастак-канструктывіст, тэатральны мастак, заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР, адзін з галоўных дзеячаў рускага авангарду.

1895 год — нямецкі фізік-эксперыментатар Вільгельм Конрад Рэнтген абвясціў аб адкрыцці ім выпраменьвання, названага пасля яго імем (рэнтгенаўскія прамяні), і стварыў першыя ўзоры рэнтгенаўскіх трубак. За гэта адкрыццё навуковец быў ганараваны Нобелеўскай прэміяй (1901), ён стаў першым нобелеўскім лаўрэатам па фізіцы.

У гэты ж дзень у «Гранд-кафэ» на бульвары Капуцынаў у Парыжы адбылася першая публічная дэманстрацыя «жывой рухомай фатаграфіі — сінематографа», вынайдзенага братамі Люм'ер. Сёння адзначаецца Міжнародны дзень кіно.

Так гаварыў...

КАНФУЦЫЙ:

«Высакародны чалавек вінаваціць сябе, нікчэмны — іншых».

УСМІХНЕМСЯ

— Парай мне кнігу, над якой ты плакаў.

— Матэматыка, 3 клас.

Як казала адна дасведчаная жанчына:

— Дзяўчаты, калі мужчына просіць вас застацца, заўсёды ўдакладняйце: застацца ў дзеўках, дурніцай, сябрамі ці да раніцы.

— Я адчуваю, што мяне ўсе ненавідзяць!

— Не перабольшвай! Цябе ненавідзяць толькі тыя, хто з табой знаёмы.

— Што б вы зрабілі, каб у вас былі грошы?

— Каб у мяне былі грошы, іх даўно ўжо не было б.

— У мяне дзве навіны.

— Расказвай спачатку добрую.

— А хто сказаў, што ёсць добрая?



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,

e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 3713.

Нумар падпісаны ў 19.30 27 снежня 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12